Нар воля 10.01.06

ПЕРАЕЗД

# Без Нацыянальнай бібліятэкі

## часовазасталасябеларускаясталіца

Пасля праваслаўных Калдц Нацыянальная бібліятэка, якая размяшчалася на вуліцы Чырвонаармейскай, перастала працаваць. Фонды закансерваваны, кнігі складзены ў кантэйнеры, якія пачалі ўжо перавозіць у новы будынак.

Старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў напрыканцы мінулага года назваў апошні тэрмін здачы славутага "брыльянта" — май 2006 года. Атрымліваецца, што пяць месяцаў чытачы бібліятэкі не будуць мець магчымасці карыстацца мільённымі фондамі буйнейшай бібліятэкі краіны.

— *Мы спыняем абслугоўванне на вельмі кароткі тэрмін,* — гаворыць намеснік дырэктара па навуковай працы Нацыянальнай бібліятэкі **Людміла Кірухіна.** — *Дарэчы, гэта даволі распаўсюджаная практыка ва ўсім свеце: вялікія бібліятэкі, калі пераязджаюць у новыя будынкі альбо мадэрнізуюць старыя памяшканні, нярэдка зачыняюцца на некаторы тэрмін, нават на некалькі гадоў. Зразумела, што таков становішча адмоўна адбіваецца на абслугоўванні чытачоў.*

*Наша бібліятэка, я мяркую, ужо ў маі зможа прадаставіць сваім чытачам кнігі з адкрытых фондаў і фондаў агульнага карыстатя. Перад намі пастаўлена такая задача. Будаўнікі павінны былі скончыць працу ў новым будынку бібліятэкі на праспекце Незалежнасці ў снежні — / скончылі, мы таксама будзем імкнуцца... Да канца года плануецца ўладкаваць усе фонды ў новым будынку, а пакуль іншыя бібліятэкі сталіцы будуць абслугоўваць нашых чытачоў.*

Як ужо неаднойчы паведамлялася, у новым будынку Нацыянальнай бібліятэкі будуць працаваць 22 чытальныя залы, якія адначасова змогуць прыняць да 2 тысяч чалавек. Кнігасховішча разлічана на 14,5 мільёна кніг. А абслугоўваць чытачоў і сачыць за ўтрыманнем кніг будуць да тысячы супрацоўнікаў.

Не будзе пуставаць і стары будынак бібліятэкі на вуліцы Чырвонаармейскай — хутка ва ўсіх карпусах, сховішчах і чытальных залах распачнецца капітальны рамонт. Плануецца, што па гэтым адрасе прапішацца другая па велічыні бібліятэка краіны — прэзідэнцкая, якая за^аз месціцца ў Доме ўрада на вуліцы Савецкай.

Дарэчы, будынак на Чырвонаармейскай вуліцы напрыканцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя архітэктар Георгій Лаўроў праектаваў менавіта як будучую дзяржаўную бібліятэку Беларусі. Гэта была першая падобная будоўля ў СССР. На жаль, праект Лаўрова да канца не ажыццявіўся. Па задумцы архітэктара, бібліятэка павінна была доўжыцца да сталічнага Дома афіцэраў з аднаго боку і да набярэжнай Свіслачы — з другога. Аднак замест корпуса дзяржаўнай бібліятэкі з'явіўся будынак, у якім размясціўся ЦКкамсамола...

Сёння Нацыянальная бібліятэка Беларусі мае каля 8 мільёнаў асобнікаў. Некаторыя з іх унікальныя і ў сваім родзе бясцэнныя. Напрыклад, біблія Скарыны альбо шкунабулы. У Беларусі 40 такіх старадаўніх кніг з вядомых у свеце 50-ці. Асаблівую каштоўнасць мае



паўмільённы фонд рэдкіх выданняў і старадрукаў. "Нацыяналка" звязана міжнародным кнігаабменам з 226 партнёрамі з 36 краін свету.

І апошняя акалічнасць. У савецкія часы Нацыянальная бібліятэка Беларусі афіцыйна насіла імя У.І.Леніна. Пасля распаду СССР ёй хацелі надаць імя Францыска Скарыны. Але далей задумы справа не пайшла...

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**